**АСТРАВЕЦКІ РАЁН**

# НАРОДНАЯ ДРАМАТУРГІЯ НІНЫ РЫБІК

**У Астравецкім раёне з поспехам ідуць пастаноўкі п'ес драматурга, празаіка, публіцыста, члена СПБ Ніны Рыбік.**

Так склалася, што драматургія ў Гродзенскай вобласці з'яўляецца не самым папулярным родам сучаснай літаратуры. Тым не менш, на Астравеччыне ў гэтым накірунку паспяхова і плённа працуе наша калега па Саюзе пісьменнікаў Беларусі, двойчы лаўрэат Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (першага – у намінацыі «Проза»; трэцяга – у намінацыі «Публіцыстыка»), вядомы ў рэспубліцы журналіст Ніна Рыбік. У розныя гады на рэгіянальных сцэнічных пляцоўках ажыццяўляліся пастаноўкі п'ес Ніны Аляксееўны. Сярод іх асаблівасцяў – адлюстраванне актуальных праблем беларускага грамадства, рэгіянальны фактар, вясковы народны каларыт, востры псіхалагізм, пераасэнсаванне хрысціянскай філасофіі, словам, усё тое, што хвалюе людзей, прыцягвае сучаснага гледача, што зразумела і блізка кожнаму з нас. Аўтарам закранаецца вострая маральная праблематыка, якая, як паветра, неабходная ў справе выхавання моладзі, і якую, на жаль, сёння не часта можна сустрэць на тэатральнай сцэне. Акрамя ўсяго іншага, пастаноўкі п'ес Ніны Рыбік носяць характар народнага, самадзейнага тэатра, у іх задзейнічаны не прафесійныя акцёры, а землякі, калегі, сябры пісьменніцы. Але дадзеная акалічнасць не пазбаўляе твораў мастацкай вартасці і сацыяльнай значнасці. Наадварот, надае ім максімальнай дакладнасці, трапнасці гучання і непасрэднай вобразнай глыбіні сэнсаў. Гэта драматургія народная і па тэматычным змесце, і па сваёй прыродзе, па сваёй сутнасці. Як бы там ні было – сёння можна з упэўненасцю сказаць: у драматычнага мастацтва Ніны Рыбік ужо ёсць свой, рэгіянальны глядач. Ці ўбачыць гэтыя пастаноўкі сталічная або гродзенская культурная грамадскасць? Ці зацікавіцца п'есамі астравецкага аўтара прафесійны тэатр? Гэтыя пытанні ставіць перад намі само жыццё. Яно ж абавязкова прынясе ў перспектыве і адказы на іх. А зараз вашай увазе – водгук Ніны Аляксееўны аб адной з нядаўніх пастановак.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

*Выкарыстаны фота з адкрытых крыніц*

# ПРА «СВАІХ І ЧУЖЫХ»

Амаль год назад з вялікім поспехам (прабачце за нясціпласць, але і сёння стаіць у вачах перапоўненая кінаканцэртная зала “Астравец”) – прайшла прэм’ера спектакля “Свае і чужыя”.
Гадавіну мы адзначылі невялікімі гастролямі: паказалі спектакль у Альхоўцы і Міхалішках.
Вядома ж, зала была не такая. Але падчас дзейства стаяла такая ж абсалютная цішыня, як і на прэм’еры. І гэтак жа, як і год таму, яе час ад часу перарывалі ўсхліпы гледачоў, якія не маглі стрымаць слёз.
…Такой жа неверагоднай была ў галоўнай ролі Вольга Лябецкая: на ёй трымаецца ўвесь спектакль.
…Гэткі ж непраказальны Антон (Анатоль Радзевіч). Нямногія ведаюць, што апошняя сцэна – цалкам яго прыдумка, і яшчэ ні разу ён не паўтарыўся ў ёй.
…Марыя Васілёнак, злая на дачку-сваявольніцу і бясконца любячая сваё гаротнае дзіця маці.
…Трохі ганарлівая на першы погляд (старшынёўская ж дачка!), а насамрэч яшчэ больш няшчасная, чым Алена, Антонава сястра Наста (Злата Радзевіч).
…Доўгаязыкая і хутканогая суседка Марыся (Вікторыя Урбановіч).
…Пяшчотная і ўдзячная Галінка, для якой Алена не мачыха — матуля (Сняжана Мікша).
…Заўсёды чужы ў матчынай хаце і ад таго сарамлівы і рэзкаваты Андрэй (Яўген Васілец).
Дзеці: басаногі, пакрыўджаны на ўсіх Андрэйка (Ігнат Урбановіч), ласкавая Галечка (Маша Няфёдава), Паўлік, які збіраецца, як і дзед, “шчаміць людзей да пазногця” (Арцём Арцем’еў).
І на чале ўсяго – рэжысёр Ганна Ашоўская, якая з майго сырога цеста разам з акцёрамі спякла пірог – як па мне, дык не самы горшы.
Дзякуй вам усім, мае дарагія! За тое, што спектакль адбыўся, што ён жыве (і, спадзяюся, яшчэ будзе жыць), што людзі ў зале плачуць і, пакідаючы яе, дзякуюць і просяць яшчэ пісаць, ставіць і прыязджаць!
Ну, калі просяць…

**Ніна РЫБІК**

**На фота:** сцэны са спектакля «Свае і чужыя» па аднайменнай пьесе Ніны Рыбік, рэжысёр Ганна Ашоўская. Астравецкі раён, Гродзенская вобласць, снежань 2023 года.

















